УДК 72.012

**Манументальнае у беларускім жывапісу канца XX стагоддзя**

Квяткоўскі А.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Гэта гістарычны факт, што толькі з прыходам Савецкай улады на Беларусі адрадзілася манументальна-дэкаратыўнае мастацтва. Трэба ўзгадаць і віцебскія часовыя роспісы Шагала, Малевіча і іх аднадумцаў, таксама роспісы, зробленыя у Доме ўраду ў 30-я гады, станковыя карціны, павялічаныя да манументальных памераў…

Згодна з пастановай кіраўніцтва і ўрада СССР усё дэкаратыўна-прыкладное мастацтва краіны Саветаў было пераведзена на прамысловыя рэйкі. У Мінску стварылася маладая, амбітная, працаздольная каманда, прасякнутая дэмакратычным духам мастакоў, як тых, хто нарадзіўся ў Беларусі, але вучыўся ў Маскве ці ў Ленінградзе (М. Данцыг, І. Стасевіч, У. Стэльмашонак і інш.), так і запрашоныя майстры – А. Бельцюкова, А. Кішчанка, М. Беляеў, Ю. Любімаў з Масквы і інш. Загадчыкам кафедры прыкладных мастацтваў БДТМІ прызначылі палескага беларуса Г. Вашчанку, які скончыў манументальнае аддзяленне у Львове.

Галоўнае пры навучанне на кафедры ў Г. Вашчанкі было наступнае: практыка – майстэрства – валоданне і тэхніка.

Чаму ў апошнія дзяцісяgoddзі мастакі-манументалісты пераходзяць у жывапіс, у стварэнне перфомансаў, напрыклад?

Маэстра вучыў, што заўсёды галоўнае – быць творчай Асобай, што жывапіс, не мае значэння, станковы ці манументальны, базіруецца на адных і тых жа асноўных прынцыпах. Ўсё залежыць ад таго, што ты хочаш сказаць. Напрыклад, калі партрэт выяўляе псіхалогію героя – ставяцца адны задачы. Гісторыка-этычнае палатно патрабуе разгорткі на сцяну, кампазіцыйнай дакладнасці і сюжэтнай выверанасці.

Вядомае параўнанне з мастакамі эпохі Адраджэння – Рафаэль пісаў партрэты, займаўся фрэскавымі роспісамі; Леанарда захапляўся інжэнэрыяй, скульптурай; Мікеланджэла ўвогуле быў сінтэтычным майстрам. Трэба не замыкацца на вузкай прафесіі манументаліста. У 60-90-я гады XX ст. у Маскве, напрыклад, існавала значная група мастакоў-манументалістаў, якія, калі ўвесь час пераходзілі з аднаго аб’екта на другі, як правіла, спусташаліся. Яны добра ведалі схемы, імі карысталіся. Працавалі якасна і віртуозна, але іх творы не трывожаць душу. Яны не ўзбагачаны натурным матэрыялам. Перад тым, як падыйсці да сцяны, адбывецца працэсс станковы – збор матэрыялу. Ён абавязковы для манументальнага жывапісу. І таму творы мастакоў-манументалістаў займаюць значную і пазнавальную прастору на выставах любога ўзроўню.